# Пасяджэнне Сумеснага камітэта Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Карэя прайшло ў Сеуле.

4 верасня 2018 г. беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам Міністра замежных спраў Андрэем Дапкюнасам наведала г. Сеул (Рэспубліка Карэя) для ўдзелу ў пятым пасяджэнні Сумеснага камітэта Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Карэя.

У складзе дэлегацыі - прадстаўнікі кіраўніцтва НАН Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі, Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі, а таксама эксперты Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Міністэрства прамысловасці.

Карэйскую дэлегацыю на пасяджэнні Сумеснага камітэта ўзначаліў намеснік Міністра замежных спраў па эканамічных пытаннях Юн Кан Хён.

У ходзе пасяджэння бакі адзначылі неабходнасць вывядзення беларуска-карэйскіх кантактаў на новы ўзровень, падкрэслілі паспяховае ўзаемадзеянне дзвюх краін у галіне высокіх тэхналогій, у тым ліку ў кантэксце працы індустрыяльна-тэхнічных паркаў, дамовіліся актывізаваць супрацоўніцтва па перадачы вопыту развіцця сярэдняга і малога бізнэсу, а таксама у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, уключаючы распрацоўку сістэмы беспапяровага гандлю і развіццё іншых праектаў электроннага ўрада.

Беларускі бок пацвердзіў сваю зацікаўленасць ва ўсталяванні бязвізавага рэжыму з Рэспублікай Карэя на двухбаковай аснове.

Па выніках сустрэчы быў падпісаны Пратакол пятага пасяджэння Сумеснага камітэта, у якім адлюстраваны асноўныя дамоўленасці. Наступнае пасяджэнне камітэта запланавана да правядзення ў г.Мінску.
Крыніца

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/07-09-2018-3459*